Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (657) Пятніца, 24 лютага 1967 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

ХАЙ ЗАЎЖДЫ БУДЗЕ СОНЦА!

20 студзеня ў актавай зале БДУ адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны слаўнай 49-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Акрамя супрацоўнікаў і студэнтаў нашага універсітэта, прысутнічалі шматлікія госці сталіцы рэспублікі—Мінска, а таксама выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі Беларускай ваеннай акругі. Прафесары, выкладчыкі, служачыя, апранутыя ў вайсковую вопратку, здаецца, зусім не былі падобны на тых, хто штодзённа старанна і клапатліва выхоўвае студэнцкую моладзь. Шматлікія ўрадавыя ўзнагароды і медалі на іх грудзях — сведка слаўных баявых дарог нашых паважаных настаўнікаў.

Рэктарат, партком, мясцком і камітэт камсамола універсітэта зрабілі ўсё для таго, каб вечар прайшоў як мага весялей, каб ён пакінуў у сэрцах прысутных цеплыню і ўрачыстасць гэтай сустрэчы. Пасля ўступнай часткі самадзейныя артысты паказалі сваё майстэрства на сцэне.

Так, дружа, хай заўжды будзе радасць, для ўсіх свеціць сонца, хай больш ніколі не паўторацца змрочныя жахі вайны!

А. СЯМЁНАЎ.

НА ЗДЫМКУ: ва універсітэцкай актавай зале выступаюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці на ўрачыстым вечары. Канцэрт трансліраваўся па тэлебачанню.

НАСУСТРАЧ 50-годдзю Савецкай улады

ЮНЫЯ ЗБІРАЮЦЦА Ў ВЫРАЙ

Маё юнацтва,
Ты, нібы мара,
Дзе, як над морам,
Ніводнай хмары...

Гэтыя радкі з верша Галіны Панько «Маё юнацтва» неўзабаве зможаце прачытаць у зборніку студэнцкай творчасці, які атрымаў паэтычную назву «Вырай».

Цікавая гісторыя нараджэння гэтага выдання. У 1963 годзе пры газеце «Беларускі універсітэт» было створана літаб'яднанне «Узлёт». Хутка яно заваявала вялікі аўтарытэт сярод студэнцтва. Тут пад кіраўніцтвам дацэнта нашага універсітэта паэта Алега Лойкі ў творчай лабараторыі адшліфоўваліся і нараджаліся новыя радкі вершаў такіх выхаванцаў нашага універсітэта, як Рыгор Семашкевіч, Хведар Чэрня, Марыя Шаўчонак, Мікола Міцкевіч, Пятро Сушко і іншыя. Некаторыя з іх ужо выдалі зборнікі сваіх вершаў. З кожным годам літаб'яднанне папаўняецца новымі сіламі.

У 1965 годзе літаб'яднанне вышла на рэспубліканскую арэну. Яго сіламі быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік «Узлёт», які атрымаў станоўчую ацэнку чытача і крытыкі. Рыхтуючыся да 50-годдзя Савецкай улады, узлётаўцы ўзялі на сябе абавязацельствы выпусціць да свята новы зборнік. Ён і названы «Вырай». Вершы ўжо сабраны, цяпер вядзецца апошняя адшліфоўка асобных вершаў і радкоў.

Пажадаем жа нашым пачынаючым паэтам шчаслівага палёту на паэтычнай арбіце.

КАНФЕРЭНЦЫЯ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ І АСПІРАНТАЎ

Вялікую цікавасць ва універсітэце выклікала адбыўшаяся днямі канферэнцыя маладых вучоных і аспірантаў, прысвечаная 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Для яе правядзення былі створаны тры секцыі: гістарычная, эканамічная і філасофская.

Пленарнае пасяджэнне адкрыў уступным словам кіраўнік канферэнцыі доктар філасофскіх навук прафесар В. І. Сцяпанаў. Ён адзначыў, што вучоныя універсітэта, ідучы насустрач слаўнаму юбілею, значна актывізавалі навуковыя даследаванні. Ад старэйшых не адстаюць і маладыя даследчыкі, аспіранты. Яскравым прыкладам можа служыць сённяшняя навуковая канферэнцыя. На яе абмеркаванне прадстаўлена каля сямідзесяці дакладаў. Многія з гэтых паведамленняў з'яўляюцца глыбокімі і творчымі самастойнымі працамі, абагульняючымі старанныя пошукі іх аўтараў.

Затым слова прадстаўляецца аспіранту Г. М. Грынбергу. Тэма яго выступлення—«Камуністычны прагрэс як новы тып грамадскага прагрэсу». Зацікавіленасць у прысутных выклікалі таксама даклады Е. З. Каваленка «У. І. Ленін аб эканамічнай ролі сацыялістычнай дзяржавы», М. А. Малянка «Шляхі пераадольвання класавых адрозненняў у працэсе камуністычнага развіцця».

Канферэнцыя прадоўжыла сваю работу па секцыях. Дваццаць шэсць дакладаў заслухалі і абмеркавалі маладыя вучоныя і аспіранты на секцыі гісторыі. Характэрна, што большасць з іх была прысвечана гісторыі Кастрычніка на Беларусі. Гэта паведамленні Э. А. Ліпецкага, У. І. Засінец і іншых. Па актуальных праблемах дзейнасці КПБ пасля XX з'езда партыі выступілі М. А. Пашкевіч—«З вопыта работы партыйных арганізацый па паляпшэнню выхаваўчай дзейнасці ў сярэдніх спецыяльных вучэбных установах БССР (1959—1965)», І. А. Сяргеяў—«Дзейнасць КПБ па фарміраванню і арганізацыйна-палітычнаму ўмацаванню органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю ў рэспубліцы (1962—1965)», М. Г. Пільшчыкаў—«КПБ — арганізатар грамадскіх пачаткаў у друку рэспублікі (1954—1965)», П. А. Кавалёў «Работа партыйных арганізацый Беларусі па далейшаму развіццю вячэрняга навучання сельскай моладзі (1959—1965)». Абмеркаванне гэтых і многіх іншых дакладаў выйшла далёка за рамкі паведамленняў.

Цікавыя даследаванні па філасофіі вядуцца маладымі вучонымі і аспірантамі кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму і кафедры гісторыі філасофіі і логікі нашага універсітэта. Не выпадкова гэтыя кафедры так шырока былі прадстаўлены на канферэнцыі (26 дакладаў). Творчую дыскусію выклікалі навуковыя паведамленні С. А. Габрусевіч—«Значэнне марксісцка-ленінскай тэорыі ісціны для мастацкай літаратуры», М. А. Мяцельскага — «Аб паняцці знака ў антычнай матэрыялістычнай філасофіі», Г. В. Кандыбо—«Бясконцасць матэрыі ў глыбіні і заканамернасці ўзаемаператварэнняў элементарных часціц» і іншыя. Гісторыкі філасофіі зрабілі справаздачу аб сваіх даследаваннях па праблемах развіцця грамадскай думкі на Беларусі, аб барацьбе філасофаў гэтага краю за развіццё марксісцкай філасофіі. Змястоўныя даклады былі прадстаўлены па пытаннях этыкі, эстэтыкі, навуковага атэізму і па іншых важных праблемах.

Актуальныя тэмы па канкрэтнай эканоміцы і тэарэтычных пытаннях эканоміі даследуюць маладыя вучоныя і аспіранты кафедры палітэканоміі. Гэта было падцверджана на канферэнцыі, на якой выступіла каля дваццаці прадстаўнікоў. Кіраўнік секцыі кандыдат эканамічных навук Ул. А. Кулажанка, падводзячы вынікі абмеркаванняў, адзначыў, што ўсе даклады падрыхтаваны на высокім навуковым узроўні, цесна звязаны з жыццём, сучаснасцю і таму могуць быць рэкамендаваны для надрукавання ў зборніку.

Юбілейная справаздача маладых вучоных і аспірантаў сведчыць аб тым, што яны маюць усе магчымасці парадаваць сваіх настаўнікаў і кіраўнікоў, увесь калектыў ардэнаноснага універсітэта шэрагам надрукаваных артыкулаў і прац, датэрміновай абаронай кандыдацкіх дысертацый.

Перапынак... Але пошукі ісціны працягваюцца. Хіба можна знайсці яе за 45 хвілін лекцыі? Вядома, для яе правільнага вырашэння будучым фізікам мала гэтага часу, патрэбна напружаная пяцігадовая вучоба, а пасля і ўсё жыццё.

Фота А. Кадзета.



КРОКІ ЮБІЛЕЙНАЙ СПАРТАКІЯДЫ

Падыходзіць да канца першынство універсітэта па валейболу сярод факультэцкіх каманд. Зараз ўжо можна падвесці некаторыя вынікі спаборніцтваў.

Нядаўна адбылася сустрэча, якая фактычна павінна вырашыць вынік першынства. Сустракаліся мацнейшыя валейбалісты фізічнага і гістарычнага факультэтаў. Барацьба ля сеткі была востpай і напружанай і прынесла вялікае задавальненне аматарам гэтай гульні. Перамогу з лікам 3:0 атрымалі фізікі. Што ж паказала гэтая сустрэча? Перш за ўсё, прыкметны рост майстэрства ігракоў некаторых каманд і ў той жа час матч яшчэ раз падцвердзіў, што ў валейболе «адзін у полі не воін». Наяўнасць у камандзе фізікаў шасці абаронцаў дала магчымасць заваяваць ім перамогу. А што ж атрымалася ў валейбалістаў — гісторыкаў? У гэтай камандзе былі два ігракі, якія ў асноўным і вытрымлівалі атакі. Ні самаадданая гра ў абароне, ні жаданне перамагчы не прынеслі поспеху. Сучасны валейбол патрабуе універсалізацыі ігракоў. У камандзе пераможцаў выдатна сыгралі Ляшчэнка і капітан каманды. Ітак, фізікі лідыруюць, не пацярпеўшы ніводнага паражэння. За імі ідуць гісторыкі.

Хочацца адзначыць і безадказнасць ігракоў філалагічнага факультэта. На чарговы паядынак з'явілася толькі тры ігракі, за што камандзе справядліва залічана паражэнне. Аб гэтым брыдкім факце трэба сур'ёзна падумаць спорткамітэту філфака, тым больш, што такое здараецца на гэтым факультэце не ў першы раз.

Сярод жаночых каманд упэўнена лідыруюць валейбалісткі матэматычнага факультэта, а за другое месца змагаюцца каманды фізічнага і хімічнага факультэтаў.

А. АСТАПАЎ.



Шырока вядома ў нашым горадзе школа матэматыкаў, якая вось ужо некалькі год працуе пры універсітэце. Не адну сотню выдатных школьнікаў-матэматыкаў падрыхтавала яна для вышэйшых навучальных устаноў краіны. Характэрна, што большасць з іх вучыцца толькі на выдатна. Юра Сатскоў, якога вы бачыце на гэтым здымку, — выхаванец школы юных матэматыкаў. Цяпер ён студэнт матфака універсітэта. Сярэднюю школу Юра закончыў на залатую медаль, на выдатна вытрымаў конкурсныя экзамены, зімовую сесію таксама здаў на выдатна.

ІДЗЕ АБМЕН КАМСАМОЛЬСКІХ БІЛЕТАЎ

Урачыстая хвіліна. Каля пакрытага кумачом стала студэнт юрыдычнага факультэта Ігнат Гаціла атрымлівае камсамольскі білет узору 1967 года. Шчаслівымі вачыма углядваецца юнак у гэтую часціну барвовага полымя баявых сцягоў, якая адсвечана водблескам агню Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

— Ігнат — табе 20. Пяцьдзесят тваёй краіне. У гэты юбілейны год ты атрымліваеш новы пяцідзесяты камсамольскі білет. Ён — твой рэвалюцыйны пашпарт. Ганарыся і даражы ім. Памятай, людзі далі табе ўжо аснову ведаў, здабытых за тысячагоддзі. Надзялілі разуменнем музыкі і цішыні, адчуваннем бялізны і вясёлкі. Паказалі мужнасць, дабрату, каханне, вернасць. Бацькі і дзяды за паўвека стварылі грамадства, якое ідзе да дастойнай і узвышанай мэты. Цяпер у жыццё выходзіш ты.

Другі сакратар камітэта камсамола БДУ Анатоль Леонаў моцна паціскае яму руку.

— Камсамолу — дзякуй! Ён даў мне жыццё, сілу, радасць, — гаворыць у адказ усхваляваны Ігнат Гаціла.

ДАВЕР'Е НАРОДА

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Купалаўскай выбарчай акрузе зарэгістрыраван рэктар нашага універсітэта акадэмік АН БССР прафесар АНТОН НІКІФАРАВІЧ СЕЎЧАНКА.

Ужо з першага курса будучым хімікам прыходзіцца сустракацца са складанай практычнай працай па механіцы малекулярнай фізікі. Вось і на гэтым здымку А. Кадзета вы бачыце іх у лабараторыі.

ДУШЫ ЗАЛАТЫЯ РОССЫПЫ

З 8 студзеня ў нашым ардэнаносным універсітэце пачаўся абмен камсамольскіх білетаў. Камсамольскія пашпарты ўжо атрымалі студэнты геолага-геаграфічнага факультэта. Цяпер поўным ходам ідзе абмен білетаў у біяфакаўцаў. Усяго новыя кніжкі ВЛКСМ у камітэце камсамола атрымала 970 юнакоў і дзяўчат.

Бачу, Ігнат, тваё хваляванне. Ведаю, у мінулым годзе ты працаваў пастухом у калгасе «Беларусь» Ляхавіцкага раёна. Цяпер ты студэнт універсітэта.

Што ж, камсамол даў табе многае. Пяць гадоў запар даручаў узначальваць камсамольскую арганізацыю калгаса. Камсамол накіраваў цябе на вучобу ва універсітэт. Ён пасылаў цябе дэлегатам на XIV з'езд камсамола Беларусі, дзе цябе выбралі членам ЦК ЛКСМБ.

Білет атрымлівае Алесь Баярчук.

— Люблю чытаць кнігі аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Што шукаю у іх? Мяне цікавіць лёс людзей, асабліва равеснікаў. Вось яны — Алег Кашавы, Зоя Касмадзям'янская, Аляксандр Матросаў, юныя камсамольцы, кожны з якіх адчуваў адказнасць не толькі за жыццё таварышаў, але і за будучае пакаленне.

Мяне хвалюе вайна. Наша пакаленне лавінна ўсё рабіць, каб не вярнулися яе мінулыя жахі.

Слухаю, Алесь, і думаю аб табе. Ты нарадзіўся ў вайну. Першыя твае дзіцячыя ўражанні звязаны з віхурай баёў у Брэсце. Гурбы жалеза, разбітыя танкі. Не духмяную кветку, якая толькі распускаецца, не усмешку маці, а гул самалётаў успамінаеш ты. Наплывам, як у кіно, узнікае жудасная карціна — узрыў трактара з тваім бацькам на міне. А потым, як у казцы. Хутка выраслa краіна, а разам з ёй вырас і узмужнеў ты. У цябе была неабмежаваная магчымасць выбіраць месца ў жыцці.

Камсамолец са стажам, ты ўжо заканчваеш універсітэт. Быў выдатным воінам-пагранічнікам, будаўніком на Ангары і збіраў цалінны хлеб. Як нёс службу і працаваў пра гэта гавораць твае медалі, якімі узнагароджан ты.

— Статут камсамола — гэта мой дапаможнік у жыцці.

Так пачала сваю размову з сакратаром Галя Семянюк, студэнтка-выпускніца біялагічнага факультэта. Угледзьцеся ў яе твар. Гэта твар шчаслівага чалавека, перад якім Радзіма адчыніла неабдымныя прасторы жыцця.

Ужо, лічы, падрыхтаваны спецыяліст з вышэйшай адукацыяй. Пастаянная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці, вечароў адпачынку, пяць гадоў вучобы была сакратаром камсамольскай арганізацыі факультэта, тройчы выбіралася групкамсоргам, прафоргам.

— Кожнаму трэба дзейнічаць! — гэтаму вучыць і патрабуе жыццё. Дзесьці я вычытала цікавую думку і раздзяляю яе — слова камунізм параўноўваю з другім словам — барацьба. Мне здаецца, гэта не выпадкова. Кожнаму трэба дзейнічаць — гэта значыць, за камунізм трэба змагацца, працаваць з яшчэ большай энергіяй, з творчым уздымам. Мы не з'яўляемся толькі пасажырамі на караблі, які цячэннем гісторыі нясе да камунізма. Я і не хачу плысці па цячэнню. Я вучуся не толькі паспяваць за жыццём, а апярэджваць яго, вучуся таленту ўмешвацца ва ўсё, да ўсяго мець справу, бачыць перспектыву і, узважыўшы пражытае, рыхтавацца да заўтрашняга, да будучага.

Сябра мой! Добра ты таварыла, адчуваўся стук твайго сэрца жыць па законах будучага. Хіба не гэтаму вучыць нас Ленін? Гэта ён разгледзеў праз імглу голада і разрухі карціну будучага, намеціў план ГОЭРЛО. Гэта ён вучыў нас не толькі марыць аб будучым, але і жыць сёння па законах яго. Што ж, гэта вялікія крокі вялікага заўтра. Слухаеш цябе, упэўніваешся — ленінскі запавет у дзеянні.

Да стала падыходзіць Ніна Зазуліна. Яна не ведала свайго бацьку — ён не вярнуўся з вайны. Дзяўчыну выхавала маці, родныя. Ніна ў гэтым годзе таксама заканчвае універсітэт. Пасля заканчэння вучобы вырашыла паехаць працаваць у самы глухі і далёкі куток нашай краіны.

Глыбокі роздум адчуваецца у яе размове. Імкненне да самастойнага жыцця, выпрацоўка сваіх адносін да яго. Выканаць наказ партыі, жыць так, як жывуць камуністы — вось найвышэйшы гонар для Ніны і яе сябровак. Вывад напрашваецца сам па сабе — эстафета бацькоў у надзейных руках.

— У маім білеце паявіўся пяты ордэн. За гэтую узнагароду перад Радзімай я яшчэ ў вялікім даўгу.

Цяжка закончваць такі артыкул, як і нялёгка стрымліваць тыя думкі, мары, якія з'яўляюцца ва ўрачыстую хвіліну атрымання камсамольскага білета. Бо размова кожнага камсамольца з сакратаром у такі час дае невычарпальны матэрыял для роздуму.

Маякоўскі пісаў:

«Не зря
эту личность
Рождает класс,
лелеет
До нужного часа
и двинет,
И в сердце вложит наказ:
«Иди, твори, отличайся...»

А. КАДЗЕТ.

СУСТРЭЧА Ў ДОМЕ РАДЫЁ

Студэнтам аддзялення журналістыкі заўсёды прадстаўляе вялікую цікавасць сустрэча з вядомымі пісьменнікамі, журналістамі краіны. Нядаўна пад кіраўніцтвам дацэнта Я. Л. Бондаравай адбылася цікавая сустрэча ў Доме радыё з карэспандэнтам усесаюзнага радыё...

Ён шмат цікавага расказаў пра сваю працу, спецыфіку работы журналіста на радыё. Пасля гэтага студэнты пазнаёміліся з работай некаторых аддзелаў рэспубліканскага радыё.

Несумненна, такая сустрэча дала шмат карыснага для трэцякурснікаў, натхніла іх на яшчэ большае тэарэтычнае авалоданне праграмных дысцыплін. Дый неўзабаве ў іх пачнецца вытворчая практыка. Тут сваю ролю адыграе і выбар той ці іншай спецыялізацыі будучай прафесіі: праца ў газеце, на радыё, на тэлебачанні, кіно і іншае.

А. Цераховіч.



Захапляюча выконзае салістка народнага аркестра Валя Гусева нацыянальныя мелодыі.

Фота А. КАДЗЕТА.

СТУДЭНТ НА ПЕДПРАКТЫЦЫ

На філалагічным факультэце закончылася педагагічная практыка студэнтаў пятых курсаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры. Упершыню яна праводзілася па новаму вучэбнаму плану на дзевятым семестры навучання ў адпаведнасці з Інструкцыяй Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ўказаннямі кафедры педагогікі універсітэта.

Педагагічная практыка з'яўляецца, як вядома, важнейшым звяном у сістэме агульнай вучэбна-метадычнай і педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў да работы ў школе. Яна мае мэтай навучыць практыкантаў усебакова прымяняць і практычна замацоўваць атрыманыя ва універсітэце веды, дапамагчы ім дэталёва вывучыць перадавы вопыт арганізацыі і правядзення вучэбнай і выхаваўчай работы сталічных школ, навучыць самастойна выконваць вучэбна-выхаваўчую і пазакласную работу, шукаць і знаходзіць шляхі вырашэння асноўных задач камуністычнага выхавання школьнікаў.

У цэлым педпрактыка, якая працягвалася з 1 верасня па 24 снежня 1966 года, прайшла паспяхова, на належным навуковым, вучэбным і метадычным узроўні. Усе студэнты добрасумленна выканалі намечаны планамі аб'ём вучэбнай і выхаваўчай работы, што, несумненна, сведчыць аб добрай пастаноўцы вучэбнага працэсу на філалагічным факультэце.

Практыку праходзіла 90 пяцікурснікаў філфака. Вучэбнымі групамі па 5 чалавек яны былі накіраваны ў лепшыя сярэднія школы і інтэрнаты г. Мінска. Як сведчаць справаздачы групавых метадыстаў, 50 студэнтаў атрымалі выдатныя адзнакі і каля сарака — добрыя.

У школах, дзе педпрактыку праходзілі філолагі, выконвалася вялікая выхаваўчая і пазакласная работа. Студэнты арганізоўвалі розныя вечары, дыспуты, канферэнцыі, сходы, культпаходы, выпускалі насценныя газеты, афармлялі вітрыны, самі выраблялі наглядныя дапаможнікі — карты, дыяграмы, плакаты, пераносныя дошкі. Так, напрыклад, студэнт аддзялення рускай мовы і літаратуры М. Дарашэнка зрабіў для школы № 17 многа наглядных дапаможнікаў, па-мастацку аформіў метадычны куток школы і расклад заняткаў, пісаў плакаты і лозунгі. Студэнт І. Белы арганізаваў сустрэчу вучняў старэйшых класаў школы-інтэрната № 3 з сынам Я. Коласа — Данілам Канстанцінавічам Міцкевічам і беларускімі пісьменнікамі.

Як высокакваліфікаваныя настаўнікі зарэкамендавалі сябе студэнты Л. Вільтоўская, З. Грышановіч, Л. Піпчанка, С. Лаўшук, М. Паканечная, Н. Машэрава, Н. Куляшова, В. Цапкова, К. Ермаліцкая, В. Шымановіч і многія іншыя.

Велізарную работу выканалі нашы метадысты і настаўнікі школ. Яны навучылі студэнтаў самастойна працаваць з вучнямі, праводзіць самыя разнастайныя выхаваўчыя мерапрыемствы. Асаблівай пахвалы заслугоўваюць метадысты З. І. Астроўская (СШ № 4), І. А. Карташова (СШ № 17), М. І. Масальская (школа-інтэрнат № 3), Б. А. Ланда (школа-інтэрнат № 1), А. І. Казей (СШ № 28), В. А. Стаскевіч (СШ № 37), В. А. Гладкая (СШ № 33), метадысты універсітэта А. А. Скачко, Т. Л. Мартынюк, Л. А. Царанкоў і іншыя.

Стану педпрактыкі ў бягучым навучальным годзе была ўдзелена вялікая ўвага з боку прафесарска-выкладчыцкага калектыву факультэта і кафедры педагогікі. Ход практыкі абмяркоўваўся на пасяджэнні Вучонага савета і на асобных кафедрах (кафедры праф. Л. І. Фіглоўскай, праф. Ф. І. Куляшова, дац. М. І. Жыркевіча). Многа выкладчыкаў факультэта наведала школы, і гэта, несумненна, садзейнічала паляпшэнню работы студэнтаў.

Аднак праведзеныя заключныя нарады, справаздачы метадыстаў і сам працэс педпрактыкі сведчаць аб тым, што ў яе арганізацыі яшчэ не ліквідаваны некаторыя недахопы, якія перашкаджаюць яе нармальнаму ходу. У перыяд практыкі неабходна адмяніць чытанне курсаў лекцый і правядзенне практычных заняткаў, усялякія камандзіроўкі студэнтаў і водпускі. Мэтазгодна пачынаць практыку з 20 верасня, што дасць магчымасць школам скласці стабільны расклад урокаў. Трэба таксама для студэнтаў выдзеліць спецыяльны метадычны кабінет, у якім была б сабрана уся факультэцкая метадычная літаратура і наглядныя дапаможнікі. Сістэматычнае папаўненне метадычнага кабінета новай літаратурай, наглядным дапаможнікамі, сродкамі навучання, пастаянныя дзяжурствы выкладчыкаў-метадыстаў факультэта ў час практыкі — усё гэта дапаможа павысіць ролю практыкі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Практыка падказвае, што неабходна больш увагі ўдзяляць школьнаму курсу мовы і літаратуры і пры чытанні лекцый па беларускай і рускай мове і літаратуры. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць падрыхтоўцы студэнтаў для выканання імі ідэйна-выхаваўчай работы ў школе, калгасе, на прадпрыемстве. Нарэшце, пажадана было б прыцягваць для чытання навейшых раздзелаў методыкі выкладання моў і літаратуры на факультэце найбольш вопытных школьных педагогаў з пагадзіннай аплатай.

Усе гэтыя і іншыя мерапрыемствы маглі б істотным чынам палепшыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных педагогаў-прадметнікаў, наблізіць навучанне ва універсітэце да запатрабаванняў школ.

Я. КАМАРОЎСКІ,
кандыдат філалагічных навык, кіраўнік педагагічнай практыкі філалагічнага факультэта.

Тры сябры—студэнты Мікалай Сідаровіч, Віталь Шастоў і аспірант Аляксандр Ільюшчанка. Яны шмат старання аддаюць спорту, культурнаму адпачынку, грамадскай рабоце і вось зараз—практычнай працы па вымярэнню каэфіцыента накіраванага дзеяння розных антэн люстравым метадам.

ПАСЛЯ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

АБАВЯЗАК КОЖНАГА

У мінулым нумары газеты «Беларускі універсітэт» быў надрукаваны артыкул Б. Шведава «Трынаццаць мужных». Ён выклікае роздум і заклапочанасць аб бестурботным жыцці ва універсітэце некаторых студэнтаў.

Чаму так атрымліваецца? Чаму не перавяліся да сённяшняга дня тыя, хто прывык і любіць адным наскокам авалодаць навукай. Вядома, здараецца, што такім аматарам вучобы выкладчык ставіць выпадкова ў залікоўку тройку, але для большасці гэтая тактыка падрыхтоўкі да экзаменаў заканчваецца правалам і яны трапляюць у непажаданую кагорту хвасцістаў.

Чаму пусцеюць кабінеты? Пытанне гэта на маю думку складанае і вырашыць яго, ды яшчэ ў пачатку семестра — рэч цяжкая. Не буду абаронцам студэнтаў, але і загадчыкі некаторых кабінетаў у многім патураюць у гэтым студэнтам. Як указвалася ў артыкуле Б. Шведава, «многія кабінеты часта знаходзяцца пад замком»?! Паспрабуй, дабярыся да яго...

К. МІХАЛІЧ.

СКАЖУ ШЧЫРА

Замежныя госці, якія часта наведваюць наш універсітэт, зайздросцяць савецкім студэнтам, што для іх паслуг ёсць выдатныя карпусы, навейшае абсталяванне ў лабараторыях, багатыя шматлікай спецыяльнай літаратурай вучэбныя кабінеты. Калі ласка, вучыся толькі. Але некаторыя студэнты грэбуюць гэтым. Скажу па шчырасці, што мяне, матэматыка, здзівіў артыкул Б. Шведава «Трынаццаць мужных». Як непрыемна чытаць і бачыць, што кабінеты пустуюць, у іх ніхто не займаецца. Матэматыку прыходзіцца напружана працаваць увесь семестр.

А вось сярод студэнтаў-філолагаў ёсць нямала такіх, што прачытваюць праграмную літаратуру па замежнай ці савецкай літаратуры за некалькі дзён. Паўстае пытанне, навошта сядзець яму ў кабінеце?

На маю думку, камітэты камсамола універсітэта і факультэтаў яшчэ недастаткова займаюцца пытаннем раскладу рабочага дня студэнтаў, мала цікавяцца, чым заняты яны ў пазалекцыйны час.

С. КОСАЎ.

ПАСМЯЁМСЯ РАЗАМ

На любым экзамене выкладчыкі справядліва патрабуюць ад студэнтаў не толькі глыбокага ведання прадметаў, але і ўмення граматна, лагічна выражаць свае думкі. Культура думкі і культура мовы знаходзяцца ў непарыўным адзінстве.

Пасля сесіі некаторыя выкладчыкі даслалі ў рэдакцыю свае сценаграфічныя запісы з адказаў некаторых студэнтаў на экзаменах.

Вось некалькі шэдэўраў «красамоўства»:

... Таварыш Анці-Дзюрынг у сваёй працы крытыкаваў Ласальяна...

— Які дзяржаўны лад у Турцыі?

— Турэцкі...

... Рэвалюцыйная сітуацыя — гэта такое становішча, калі старое не можа жыць па-новаму, а новае не можа жыць па-старому.

...Як пісаў Маркс у пісьме да Федзі Мейера.

...У Аўстрыі жыве вымершая птушка Эму.

...Спартак загінуў, але паўстанне пад яго кіраўніцтвам яшчэ працягвалася доўга.

...У Еўрапейскай тайзе водзіцца таксама і буры мядзьведзь.

— А ў Сібірскай?

— Таксама.

— Што таксама?

— Белы.

Даслалі Э. Клёсава, С. Зубовіч, Н. Каляда.

СУД ТАВАРЫШАЎ

Ідзе суд! Суд таварышаў. Купрэйчык, студэнт першага курса аддзялення журналістыкі, стаіць нізка апусціўшы галаву. Ён не можа падняць яе і паглядзець у вочы таварышам, ён гаворыць такім ціхім голасам, што некаторыя яго словы нават нельга разабраць.

Які ж учынак зрабіў Віктар?.. Усё, здаецца, ішло добра. Адсвяткавалі дзень нараджэння сваёй былой аднакласніцы. Падвыпіўшы моцна, пайшлі дахаты і... пабіліся. А калі праходзячы міма незнаёмы паспрабаваў разняць расчырванелых ад крыві «пеўняў», дык яны накінуліся на яго. Трое білі аднаго, білі доўга. Невядома, чым бы гэта ўсё скончылася, калі б не супрацоўнікі грамадскага парадку...

Гісторыя хоць і кароткая, але брыдкая і непрыстойная для студэнта вышэйшай навучальнай установы. Таму Віктар чакаў, відаць, што таварышы так сурова і прынцыпова будуць крытыкаваць яго. Сход курса выліўся ў агульнае рэчышча справядлівых абурэнняў. Ніхто не застаўся раўнадушным да ўчынка Віктара...

Нехта прыкмячае, што Віктару трэба прабачыць усё, маўляў, хлопец ён малады, а быў бы больш дарослым, гэтага не здарылася б. Але з гэтым меркаваннем ніхто не згаджаецца. Маскоўская школьніца Зоя ўвайшла ў бяссмерце ў свае 18 год, Матросаў закрыў амбразуру дота. А былі ж і баязліўцы, што здрадзілі Радзіме.

Суд таварышаў. Магчыма, ён быў занадта жорсткім у адносінах да Віктара? Былі пастаўлены два пытанні на галасаванне. Першае — пакінуць Віктара ў камсамоле, другое — выключыць. Большасць выказалася за першую прапанову. Так вырашыў камсамольскі сход курса...

Г. МАЦУК.

КОЖНАМУ ВЫПУСКНІКУ — ганаровую адзнаку спартсмена

У нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага паляпшэнню матэрыяльнага дабрабыту працоўных, развіццю асветы, ахове здароўя, фізкультуры і спорту.

У жніўні-снежні 1966 года і пачатку бягучага года ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР, а таксама ЦК КП Беларусі і Савет Міністраў БССР прынялі шэраг пастаноў па паляпшэнню спартыўнай і аздараўленчай работы сярод насельніцтва. Такая ўвага развіццю фізкультуры і спорту добра зразумела. Вядома, што толькі фізічна здаровы, загартаваны чалавек можа плённа займацца навукай, працаваць на вытворчасці, авалодваць ведамі.

Для паляпшэння фізічнага выхавання моладзі шмат робіцца і ў нашым універсітэце. І тут мне хочацца спаслацца на нядаўніх выпускнікоў матэматычнага і фізічнага факультэтаў. Месяц назад яны скончылі вучобу ва універсітэце і былі накіраваны на работу ў навукова-даследчыя інстытуты, школы, на прадпрыемствы. Добрае папаўненне атрымала працоўная сям'я краіны: гэта не толькі здольныя спецыялісты, але і фізічна моцныя людзі.

Летам 1966 года асноўная маса студэнтаў фізічнага і матэматычнага факультэтаў правяла свой адпачынак у спартыўным лагеры ДТСААФ. Тут перш за ўсё ўдзялялася вялікая ўвага ўсебаковай падрыхтоўцы спартсменаў-разраднікаў, спартыўных арганізатараў і суддзяў. Амаль усе сталі значкістамі ГТО, а 58% студэнтаў здалі нарматывы ваенна—спартыўнага комплексу. А трэба сказаць, што гэты комплекс патрабуе ўсебаковай фізічнай падрыхтоўкі і асаблівай трэніраванасці. Значна папоўніўся і лік універсітэцкіх разраднікаў.

Нарматывы комплексу «Воін-спартсмен» І ступені паспяхова выканалі І. Хугалеў, І. Казлоў, В. Аніщчык, Е. Васілеўскі і многія іншыя. Універсітэт можа па праву імі ганарыцца. Выдатнымі арганізатарамі спартыўнай работы і здольнымі суддзямі паказалі сябе В. Гуманаў, С. Мулярчык, Р. Вольскі, а таксама многія іншыя.

Усе яны з вялікай удзячнасцю адклікаліся аб рабоце ў лагеры майстра спорту СССР па боксу У. С. Мурашова, старшыні ДТСААФ Б. Г. Бондарава і іншых выкладчыкаў, якія не шкадавалі ні сіл, ні часу для таго, каб перадаць свой вопыт моладзі.

Урачыста былі падведзены вынікі работы спартыўнага лагера. Прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў уручыў студэнтам пасведчанні і значкі «Воін-спартсмен» і пажадаў ім новых поспехаў у працы.

Канешне, вынікі маглі быць лепшымі. І тут трэба зазначыць, што кафедры фізвыхавання, напрыклад, неабходна звярнуць больш увагі на выхаваўчую фізічную падрыхтоўку, асабліва на гімнастыку (сілавыя практыкаванні), кросавую падрыхтоўку на лыжах і плаванне.

Надышоў час абсталяваць спецыяльныя спортзалы ва універсітэце. У новым гімнастычным зале, дзе студэнты займаюцца боксам, дасюль няма ніводнага баксёрскага спараду. Гэта рэзка ўплывае на падрыхтоўку разраднікаў. Ужо некалькі разоў газета «Беларускі універсітэт» узнімала пытанне аб абсталяванні на факультэтах парашутных класаў, але воз, як кажуць, і цяпер там.

Ужо другі год дзейнічае новы спартыўна-тэхнічны комплекс «Гатоў да абароны Радзімы». Гэты комплекс павінны засвоіць студэнты ўжо на першых курсах навучання ва універсітэце, таму што для найбольш фізічна падрыхтаваных юнакоў камітэт ДТСААФ, на трэцім—чацвёртых курсах арганізуе здачу нарматываў яшчэ больш складанага комплексу — «Воін-спартсмен». Але гэтыя заданні выконваюцца яшчэ слаба.

У сувязі з узнагародай універсітэта ордэнам неабходна, каб кафедра фізвыхавання і спорту, арганізацыі ДТСААФ усіх факультэтаў узмацнілі свае намаганні па фізічнаму выхаванню студэнтаў.

У нас ёсць усе магчымасці дабіцца таго, каб кожны выпускнік пакідаў універсітэт, маючы некалькі ганаровых спартыўных і абаронных значкоў.

В. КОМАР, выкладчык.

На здымку: уручэнне значкоў ганаровых адзнак спартсмена выпускнікам.



НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

12—16 СТУДЗЕНЯ ў старадаўнім беларускім горадзе на Дняпры Магілёве праводзілася першынство рэспублікі сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па хакею з шайбай. У цяжкіх паядынках наша каманда заняла другое прызавое месца. Лепшы бамбардзір першынства—студэнт другога курса юрыдычнага факультэта універсітэта О. Севідаў, які закінуў 15 шайб саперникам.

У МАСКВЕ закончыўся паўфінал Усесаюзнага першынства «Буравесніка» па міжнародных шашках. Студэнт матэматычнага факультэта Барыс Агашын заняў шостае месца і заваяваў права выступаць у першынстве УЦСПС сярод юніораў у Ленінградзе. Гэтага права дабіліся таксама нашы вядомыя шашысты Анатоль Гантварг, Дзмітрый Сухарукаў і Міхаіл Кац. Пуцёўкі ў Кіеў на першынство УЦСПС па рускіх шашках сярод юніораў заваявалі Уладзімір Беляеўскі, Іосіф Марголін і Рыгор Пеўзнер.

Гэтыя чэмпіянаты адбудуцца з 25-сакавіка па 5 красавіка.

ВЯЛІКАГА ПОСПЕХУ дабіўся ў закончыўшымся ў Гомелі паўфінале першынства рэспублікі кандыдат у майстры з матфака Рыгор Пеўзнер. Юны шашыст ў першы раз атрымаў права выступаць у фінале першынства рэспублікі.

НА ЗАКОНЧАНЫМ чэмпіянаце сталіцы па рускіх шашках упэўненую перамогу атрымаў студэнт першага курса матфака Уладзімір Беляеўскі. Набраўшы дзесяць з паловай ачкоў, ён да тытула чэмпіёна рэспублікі сярод студэнтаў дадаў яшчэ адзін—чэмпіёна сталіцы. Яго асноўны канкурэнт сам экс-чэмпіён краіны Аркадзій Плакхін так і не змог ліквідаваць разрыў у паўачка на працягу ўсяго турніра. Шостае месца з 8,5 ачкамі заняў аспірант фізічнага факультэта Георг Пятровіч. Абодва нашы шашысты ўпершыню перашагнулі майстарскі рубеж.

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА НАШАЙ ШКОЛЫ

Шырока былі прадстаўлены шашысты універсітэта на паўфіналах Усесаюзнага першынства «Буравесніка» па рускіх шашках. Мацнейшых сабраў маскоўскі паўфінал. Тут за права ўдзелу ў фінале змагалася 8 майстроў і столькі ж кандыдатаў у майстры. Паспяхова правёў усе паядынкі чэмпіён нашай рэспублікі сярод студэнтаў Уладзімір Беляеўскі. Атрымаўшы пяць перамог і дзесяць звёўшы ўнічыю, ён раздзяліў другое-трэцяе месца з вядомым ленінградскім майстрам В. Галасуевым. Перамогу ў паўфінале заваяваў выпускнік МРТІ майстар спорту Віктар Прыяткін. Гэта вялікі поспех беларускіх студэнтаў. Абое яны заваявалі права ўдзельнічаць у фінале, а Уладзімір Беляеўскі яшчэ і права прысваення яму звання майстра спорту.

Другі наш прадстаўнік юны майстар Міхаіл Кац таксама накіроўваў усе сілы на атрыманне перамог. Ён нават з павышанай тэмпературай прыходзіў на гульні, але хвароба не дала яму магчымасці ўдзельнічаць у вострай канкурэнцыі. М. Кац застаўся за мяжой фіналістаў.

У Вінніцы выступалі чэмпіён рэспублікі майстар спорту Генадзь Хацкевіч і кандыдаты ў майстры Барыс Бліндэр і Георг Пятровіч. З першых тураў лідэрства захапіў Генадзь Хацкевіч. Чатыры перамогі на старце дазволілі яму зберагчы лідэрства да канца. Набраўшы дзевяць ачкоў, ён стаў пераможцам паўфінала. Добра правёў усе спаборніцтвы і студэнт трэцяга курса матфака Барыс Бліндэр. З васьмю ачкамі ён заняў чацвёртае месца і таксама выйшаў у фінал. А вось Георг Пятровіч быў занадта міралюбівы: адзінаццаць нічыіх, адна перамога і адно паражэнне. Мэта не дасягнута, але і восьмае месца ў такіх спаборніцтвах—нядрэнны вынік.

Сенсацыяй томскага паўфінала стаў поспех чэмпіёнкі Беларусі студэнткі нашага універсітэта Лены Соркінай. Упершыню на мужчынскія паўфіналы быў запрошан майстар спорту — жанчына. І трэба сказаць, што Лена прыпаднесла добры ўрок мужчынам. Майстар Явельберг вымушаны быў капітуляваць, а Эльфант, Кузюкоў і Кескер задаволіліся нічыімі. Набраўшы дзесяць ачкоў, наша шашыстка выйшла на трэцяе месца і атрымала права выступаць у фінале. Паспяхова іграў Уладзімір Ляхаданаў. Ён адзіны, хто нанёс паражэнне пераможцу паўфінала харкаўскаму майстру Ю. Кескеру. У Валодзі дзевяць ачкоў, ён таксама фіналіст.

Такім чынам сярод 18 удзельнікаў студэнцкага першынства СССР будзе пяць прадстаўнікоў нашага ардэнаноснага універсітэта. Гэта вялікая перамога беларускай універсітэцкай шашачнай школы.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

НЕ СПЫНЯЮЧЫСЯ НА ДАСЯГНУТЫМ

Адным з найбольш мнагалікіх атрадаў сярод аматараў спорту ў нашым універсітэце з'яўляюцца валейбалісты. Гэтаму садзейнічала ўвядзенне спецыялізацыі па валейболу для студэнтаў першых курсаў. У бягучым навучальным годзе секцыя валейбола правяла міжфакультэцкія спаборніцтвы для студэнтаў першых курсаў. Асабліва цікава правялі паядынкі супрацоўнікі фізфака. Восем факультэцкіх каманд прынялі ўдзел на першынство супрацоўнікаў мясцкома БДУ.

У гарадскіх спаборніцтвах выступалі зборныя каманды універсітэта. Першая каманда дзяўчат выйграла першынство вну горада Мінска па першай групе. І тыя ж каманды ў другім крузе клубнага першынства горада, зрабіўшы дубль, выйгралі першыя месцы.

Неабходна адзначыць, што ў клубным першынстве горада зборная жанчын выступала без вядучых ігракоў: Люды Антонавай і Валі Трахіменка, якія ў складзе зборнай каманды рэспублікі рыхтуюцца да Спартакіяды народаў СССР.

З вялікім поспехам у клубным першынстве горада Мінска выступіла і мужчынская зборная універсітэта, якая заняла другое месца. Ва ўпартай барацьбе хлопцы толькі ў пятай партыі ўступілі студэнтам інстытута фізкультуры. Лепшыя іракі універсітэта ўключаны ў зборную каманду Мінска, якая рыхтуецца да першынства Беларусі. Сярод іх будуць Тома Барысава і Ядзя Цыбульская (хімфак), Лена Балабанава (фізфак), Барыс Шабановіч і Леанід Гвоздзь (гістфак), Сяргей Хахлюк (фізфак).

Напорадзе занальнае першынство вну рэспублікі. Усе ўдзельнікі старанна рыхтуюцца да гэтых важных для нас спаборніцтваў.

М. Кучынскі,
старшы выкладчык
кафедры фізвыхавання
і спорту.

ПАРАДЫ ПАЧЫНАЮЧЫМ

(ГУМАР)

Раней, чым стаць на канькі, навучыцеся правільна падаць. Падаць лепш за ўсё наперад: прыемней, калі бачыш, куды падаеш. Дарэчы, падымайцеся з усмешкай і рабіце выгляд, што вы завязвалі шнурок.

Перш за ўсё запамятайце: лыжы надзяюцца на ногі, а палкі на рукі. Палкі—гэта тое, што з вострым канцом. Спускаючыся з гары, старайцеся не абганяць свае лыжы. Гэта кепская прымета.

Калі вы рана прымянілі сілавы прыём і бачыце, што праціўнік доўга не падымаецца, а свістка няма, ведайце—вы ўлажылі суддзю.

ЧЭМПІЁН «БУРАВЕСНІКА»

Па класіфікацыйнаму складу гэтыя спаборніцтвы «Буравесніка» па міжнародных шашках на званне чэмпіёна рэспублікі былі аднымі з самых мацнейшых. Ганаровае званне аспрэчвала дзесяць майстроў і шэсць кандыдатаў у майстры спорту. Барацьба за залатыя медалі завяршылася дуэлью паміж юным Анатолем Гантваргам і вопытным Маратам Гелерам. Апошні не вытрымаў наступлення і ўступіў перамогу таленавітаму шашысту. Студэнт першага курса матэматычнага факультэта да сваіх тытулаў чэмпіёна СССР сярод юнакоў дадаў яшчэ адзін—чэмпіёна рэспублікі сярод студэнтаў. Адзін з мацнейшых шашыстаў краіны ён цяпер старанна рыхтуецца да міжнароднага турніру «Брынта», які адбудзецца ў маі ў Галандыі.

У падрыхтоўцы гэтай старонкі ўдзельнічалі старшыня шашачнага клуба БДУ Г. ДРАБУШЭВІЧ і выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Г. МАЛОЧКА.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

АТ 22308 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 522.